# КРОК ДА АБУДЖЭННЯ

## ЗВАРОТ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСКАГА АРГАНІЗАЦЫЙНАГА КАМІТЭТА ПА СВЯТКАВАННІ 400-ГОДДЗЯ БЕРАСЦЕЙСКАЕ ЦАРКОЎНАЕ УНІІ

18 кастрычніка спаўняецца 400 гадоў з дня падпісання Берасцейскае Уніі. За ўсю больш як тысячагадовую гісторыю Хрысціянства на Беларусі, ад часу хрышчэння Полацкага й Тураўскага княства у канцы 10 ст., Берасцейская царкоўная унія — самая буйная рэлігійная падзея ў нашай краіне. Сабор, што адбыўся 8 (18) кастрычніка 1596 г. у царкве св. Міколы ў Берасці, меў на мэце далучыць Праваслаўную царкву Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага да сусветнае Каталіцкае царквы праз саюз (унію) з Рымам і, такім чынам, утварыць сваю, адзіную для праваслаўных і католікаў, царкву на тэрыторыі старажытнае Беларусі. Праваслаўныя іерархі Княства, якія падпісалі унію, верылі, што новая Каталіцкая царква Візантыйскага абраду прынясе рэлігійны мір народу й краіне. Ролю такой царквы ва ўмацаванні не толькі духоўнага, але й дзяржаўнага адзінства краіны разумелі і найбольш прагрэсіўныя дзеячы ВКЛ, што актыўна падтрымлівалі ідэю Уніі.

Паступова Уніяцтва пашырылася на ўсю тэрыторыю тагачаснае Беларусі — у канцы 18 ст., напярэдадні падзелаў Рэчы Паспалітай і захопу Беларусі Расейскай Імперыяй, абсалютная большасць беларусаў былі уніятамі. Гвалтоўнае знішчэнне Уніі ў 1839 г. пературылася ў трагедыю не толькі для самое царквы, але й для ўсёй культуры беларускага народа. Бо за два з паловай стагоддзі свайго існавання Уніяцтва стала сапраўдным аб'яднаўчым фактарам духоўнага жыцця краіны. Была створаная велізарная самабытная культура, якая ахоплівала адукацыю, кнігадрукаванне, літаратуру, храмавую архітэктуру, іканапіс, ювелірнае і ўжытковае мастацтва і інш. Пры уніяцкіх кляштарах працавалі школы й друкарні, што на працягу доўгіх часоў былі адзінымі носьбітамі беларускасці ва ўмовах як паланізацыі, так і русіфікацыі.

Пасля афіцыйнай ліквідацыі Уніяцтва працягвала існаваць у некаторых асяродках Беларусі і ў наступныя паўтара стагоддзя, перажыло некалькі адраджэнняў і перыядаў занападу, заўсёды падзяляючы лёс свайго народа. У 1990 г. Уніяцкая царква зноў уваскрэсла на нашай зямлі як знак духоўнага адраджэння нацыі.

Мы спадзяёмся, што святкаванне 400-х угодкаў Берасцейскай Уніі стане яшчэ адным крокам на шляху духоўнага абуджэння самасвядомасці й нацыянальнага адзінства беларускага народа.

**Анатоль ГРЫЦКЕВІЧ,**
**Мікола КРУКОЎСКІ, сустаршыні камітэта Уладзімір КОНАН,**
**Леанід АКАЛОВІЧ, намеснікі**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ